# «Лёгкай хадою – у добры шлях!»

Выдатнай традыцыяй Воранаўскай дзіцячай школы мастацтваў стала мерапрыемства, якое дае пачынаючым артыстам пуцёўку ў музычнае жыццё – «Прысвячэнне ў першакласнікі».

«Прысвячэння» праходзяць для навучэнцаў усіх аддзяленняў школы, але для юных харэографаў гэта мерапрыемства адбылося ўпершыню.

Яркія танцавальныя нумары ўсіх узроставых груп танцавальнага калектыву «Сузор'е», мастацкім кіраўніком і натхняльнікам якога з'яўляецца малады і перспектыўны педагог Марта Янаўна Макрыцкая, выклікалі буру апладысментаў і яркіх эмоцый. Выдатнымі нумарамі падтрымалі сваіх таварышаў вучні харавога аддзялення.

Словы пажаданняў юным артыстам прагучалі ад старэйшых таварышаў, педагогаў і бацькоў. Сімвалічным стала перадача рэліквіі – статуэткі танцоркі – ад старэйшых навучэнцаў першакласнікам.

Хай гэта знамянальная падзея адкрые шлях у творчасць ўсім, хто любіць і шануе мастацтва танца!



